# Фантастыка і сімвалізм сусвету Алены Кіш



З ініцыятывы згуртавання «Мастацкі маёнтак» напрыканцы мінулага лета ў вёсцы Дубравы Лагойскага раёна быў праведзены жывапісны пленэр «З Аленай Кіш у сэрцы». Выстаўка паводле вынікаў згаданага пленэру пры канцы лістапада адчынілася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Яе ідэя была рэалізаваная дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе», галерэі «Дом карцін», установы «Цэнтр экалагічных рашэнняў», а таксама пры падтрымцы прыватных калекцыянераў.

Як падкрэсліў на адкрыцці выстаўкі 23 лістапада прафесар, прарэктар па навуковай рабоце БДУКіМ Віктар Языковіч, традыцыйнае мастацтва, каштоўнасці і светаўспрыманне беларускага народа, якія выяўляюць творы Алены Кіш – гэта тыя кропкі адліку, з якіх пачынаецца сапраўды народнае мастацтва.



*«Музыка для Алены». А. Дзямідаў*

«Накірунак, у якім працавала Алена Кіш, называюць наіўным, – заўважыў В. Языковіч, – але яе мастацтва таксама глыбокае і сімвалічнае. І ў гэтым спалучэнні наіўнасці і глыбіні мы бачым каштоўнасць твораў Алены Кіш».

У зале мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» выстаўленыя аўтарскія творы, створаныя ўдзельнікамі пленэру «З Аленай Кіш у сэрцы» – Ганнай Балаш, Аляксандрам Дзямідавым, Аляксандрам Рэпкам, Аляксандрам Наўгародцавым ды інш. Але наведнікаў выстаўкі захапляла найперш і тое, што яны змаглі пазнаёміцца, адчуць чароўную аўру арыгіналаў маляванак Алены Кіш.

Для выстаўкі іх прадставілі супрацоўнікі гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе», а таксама прыватныя калекцыянеры. Сярод гэтых вобразных фантазій і чароўных сімвалаў аматары беларускага мастацтва змаглі ўбачыць такія шэдэўры наіўнага мастацтва, як маляванкі «Рай», «Дзева на водах», «У райскім садзе», «Ліст да каханага» ды іншыя творы А. Кіш, якія цудам захаваліся дзякуючы музейным работнікам і калекцыянерам.

Наведнікаў цікавіла таксама, як жывапісныя творы пленэру «З Аленай Кіш у сэрцы» ўвабралі ў сябе мастацкі светапогляд А. Кіш. Пераканаўчымі ўзорамі пераасэнсавання творчай манеры і вобразнага строю беларускай мастачкі можна было назваць палотны Г. Балаш («Домік для Алены», «Алена Кіш прыйшла на худ.савет»), А. Дзямідава («Музыка для Алены», «Прысвячэнне Алене»). Іншыя ж творцы сваімі працамі паводле вобразаў, створаных А. Кіш, выказалі паважлівае стаўленне да спадчыны геніяльнай і трагічнай мастачкі, якой давялося жыць (1889 – 1949) і ствараць свае маляванкі ў цяжкі міжваенны перыяд.

Вядомы беларускі мастацтвазнаўца, арт-крытык Ларыса Фінкельштэйн адзначыла: «Творчасць Алены Кіш – невычарпальная крыніца натхнення для сучасных мастакоў. Яе творчасць і лёс недастаткова вывучаныя, а таму яна часта застаецца мала зразумелая сучасным мастакам і нават мастацтвазнаўцам. У яе творы можна ўглядацца зноў і зноў, знаходзячы новыя рысы вобразаў, сімвалаў і плыняў. Да маляванак Алены Кіш звярталіся шмат хто з беларускіх жывапіўцаў, для якіх Кіш – крыніца натхнення, асоба, якая прываблівае мастакоў. Беларуская мастачка стварыла свой фантастычны сусвет, але не местачковы, а больш глабальны, сусветны. Я б назвала яе мастачкай без межаў», – адзначыла мастацтвазнаўца.



*Л. Фінкельштэйн*

Выстаўка, што доўжылася некалькі дзён, да 7 снежня, выклікала вялікую цікавасць сярод прафесійных мастакоў, студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, усіх аматараў народнага мастацтва.

*Анатоль МЯЛЬГУЙ, фота аўтара*